Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 64 (133)
ПАНЯДЗЕЛАК
18
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

1 стар. — **Зварот Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Беларусі да ўсіх выбаршчыкаў заходніх абласцей Беларусі, рабочых, работніц, сялян і сялянак, да Чырвонай Арміі, да совецкай інтэлігенцыі.**

2 стар. — Іван Вікенцьевіч Ігнатовіч (біяграфічны нарыс). Выбарчы ўчастак і завод. Абласная нарада сялян. 69 гадавіна Парыжскай Комуны.

3 стар. — Расказы аб жыцці ў былой панскай Польшчы — турме народаў. Ніколі гэтага не забудзем. Растуць мопраўскія рады.

4 стар. — Тэатр —«Пагібель Воўка».

За рубяжом: Прэзідэнт Фінляндыі ратыфікаваў совецка — фінляндскі мірны дагавор. Працоўныя Англіі вітаюць мірную палітыку СССР. Замежны друк аб заключэнні мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй. Паўторны візіт Уэлеса ў Італію.

Прызыў новых ваеннаабавязаных у Англіі. На заходнім фронце. Аперацыі на моры.

ЗВАРОТ

ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў) БЕЛАРУСІ

Да ўсіх выбаршчыкаў заходніх абласцей Беларусі, рабочых, работніц, сялян і сялянак, да Чырвонай Арміі, да совецкай інтэлігенцыі.

ТАВАРЫШЫ!

24 сакавіка 1940 года працоўныя заходніх абласцей Совецкай Беларусі на аснове Сталінскай Канстытуцыі будуць выбіраць дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Працоўныя заходніх абласцей Беларусі, з дапамогай вялікага народа Краіны Советаў, з дапамогай гераічнай Чырвонай Арміі, знішчылі ўладу памешчыкаў і капіталістаў, знішчылі каланіяльнае падняволенне і эксплаатацыю, нацыянальнае прыгнечанне і палітычнае бяспраўе.

Народнае Сабранне Заходняй Беларусі, выражаючы волю народа, аднадушна дэкларыравала ўстанаўленне на тэрыторыі Заходняй Беларусі совецкай улады, як адзінай народнай улады, з'еднанне з адзінакроўным народам Совецкай Беларусі і ўваходжанне ў Саюз Совецкіх Социялістычных Рэспублік. Прынятыя ў дружную сям'ю народаў СССР, народы Заходняй Беларусі ўпершыню атрымалі вялікае права выбіраць у вышэйшыя органы ўлады сваіх, сапраўды народных прадстаўнікоў, самых дастойных сыноў і дачок нашай Вялікай соцыялістычнай радзімы.

Гэта вялікае права дала совецкая ўлада і партыя большэвікоў, кіруемая любімым правадыром таварышам Сталіным.

Партыя большэвікоў выступае на выбарах у блоку, у саюзе з беспартыйнымі рабочымі, сялянамі, служачымі, інтэлігенцыяй. Зарэгістраваныя ў выбарчых акругах кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР, — як комуністы, так і беспартыйныя, — вылучаны агульнымі сходамі рабочых і служачых па заводах, сходамі сялян па сёлах, — на аснове выбарчага саюза комуністаў і беспартыйных. Гэтыя кандыдатуры аднадушна падтрыманы многалікімі мітынгамі працоўных па выбарчых акругах і ўчастках.

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Беларусі заклікае ўсіх комуністаў дружна, як адзін, галасаваць як за партыйных, так і за беспартыйных кандыдатаў.

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Беларусі разлічвае, што беспартыйныя выбаршчыкі будуць таксама дружна галасаваць за комуністаў-кандыдатаў, як за кандыдатаў-беспартыйных.

Ці ёсць у выбаршчыкаў падстава галасаваць за кандыдатаў большэвіцкай партыі?

Ці заслугоўвае партыя большэвікоў таго давер'я, на якое яна разлічвае ў прадстаячых выбарах?

Чым была наша радзіма пры панаванні памешчыкаў і капіталістаў і чаго яна дасягнула пры ўладзе рабочых і сялян, пры кіраўніцтве большэвіцкай партыі?

Народы Заходняй Беларусі складаюць адзіную сям'ю народаў нашай краіны, воблік якой за годы Совецкай улады змяніўся ў корані. З краіны адсталасці і сярэдневякоўя, цемры і бескультур'я, галечы, бяспраўя і прыгнечання працоўных, якой была царская Расія, наша краіна ператварылася ў перадавую, культурную, магутную соцыялістычную дзяржаву.

Народы Заходняй Беларусі, жывучы пад ярмом польскіх памешчыкаў і капіталістаў, заўсёды звярталі свае погляды на **Ўсход, на краіну соцыялізма,** з надзеяй чакаючы дня, калі на **іх зямлі заззяе яркае сонца Советаў.** Гэты дзень прышоў 17 верасня 1939 года, калі часці доблеснай Чырвонай Арміі вызвалілі працоўных Заходняй Беларусі. Прайшло ўсяго 6 месяцаў, а якія велізарныя змяненні адбыліся ў жыцці працоўных мас заходніх абласцей Совецкай Беларусі. Разгарнулася творчая работа ва ўсіх галінах вытворчасці, у галіне культуры і навукі. Рабочыя і сяляне, якія не мелі раней ніякіх палітычных правоў, зараз атрымалі ўсе правы, сталі поўнапраўнымі гаспадарамі свайго жыцця. Разам з усім совецкім народам, народы заходніх абласцей Совецкай Беларусі будуюць соцыялістычнае грамадства.

Гэтых поспехаў дабіўся наш народ пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў.

Хто імкнецца да таго, каб наша радзіма была і надалей магутнай, культурнай і свабоднай соцыялістычнай дзяржавай, той будзе галасаваць за партыю большэвікоў, той будзе галасаваць за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

У нашай краіне назаўсёды ліквідаваны капіталістычная сістэма гаспадаркі і эксплаататарскія класы, адменена прыватная ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці і знішчана эксплаатацыя чалавека чалавекам. Як непахісная аснова нашага совецкага грамадства, зацверджана соцыялістычная ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці.

Народнае Сабранне Заходняй Беларусі аднадушна абвясціла нацыяналізацыю банкаў і буйнай прамысловасці Заходняй Беларусі.

Усе каштоўнасці банкаў, усе буйныя фабрыкі, заводы, усе чыгункі сталі ўсенародным здабыткам, г. зн. дзяржаўнай уласнасцю.

На вызваленай зямлі няма і не будзе месца паразітам-фабрыкантам, заводчыкам і банкірам.

Гэтай сусветна-гістарычнай перамогі дабіўся наш народ пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў.

Хто імкнецца да таго, каб працоўныя Совецкага Саюза былі назаўсёды свабодныя ад ярма эксплаатацыі, той будзе галасаваць за партыю большэвікоў, той будзе галасаваць за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Перамога соцыялізма ў СССР забяспечыла росквіт прамысловасці. За годы сталінскіх пяцігодак створана першакласная прамысловасць, аснашчоная сучаснай тэхнікай. Аб'ём вытворчасці нашых соцыялістычных фабрык і заводаў праўзыходзіць аб'ём вытворчасці прамысловасці даваеннага часу больш чым у дзесяць разоў.

Перамога соцыялізма ў СССР забяспечыла ператварэнне Беларусі з былой калоніі царскай Расіі, амаль пазбаўленай прамысловасці, з краіны адсталай сельскай гаспадаркі, у перадавую індустрыяльна-калгасную соцыялістычную рэспубліку з першакласнай прамысловасцю і магутнай калектыўнай соцыялістычнай сельскай гаспадаркай, аснашчонай перадавой тэхнікай.

За годы Совецкай улады ў БССР створана магутная энергетычная база. Толькі адна Асінаўская электрастанцыя выпрацоўвае ў адзін год у некалькі дзесяткаў разоў больш электраэнергіі, чым усе разам узятыя электрастанцыі дарэволюцыйнай Беларусі. У БССР створана магутная тарфяная, хімічная і дрэваапрацоўчая прамысловасць, створаны новыя заводы машынабудаўніцтва і станкабудаўніцтва, створана буйная швейная, скураная, трыкатажная і харчовая прамысловасць. На палях БССР працуе 10 тысяч трактараў і дзесяткі тысяч іншых сельскагаспадарчых машын. Гэта тэхніка аблягчае працу, узнімае небывала яе прадукцыйнасць і з'яўляецца магутным сродкам паднятцця матэрыяльна-бытавога і культурнага ўзроўню працоўных.

Гэтыя перамогі Совецкі народ заваяваў пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў.

Хто імкнецца да таго, каб наша соцыялістычная прамысловасць, соцыялістычная сельская гаспадарка ў далейшым квітнела, той будзе галасаваць за партыю большэвікоў, той будзе галасаваць за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Былая панская Польшча з'яўлялася краінай буйнага памешчыцкага **землеўладання. Польскія ўлады,** памешчыкі і асаднікі грабілі сялянскія масы вёскі. У выніку гэтага грабяжу, на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі велізарная маса сялянскіх гаспадарак былі зусім пазбаўлены зямлі, не мелі коней і кароў. Рашэннем Народнага Сабрання Заходняй Беларусі памешчыцкая зямля перадана працоўнаму сялянству, перадана тым, хто на ёй працаваў вякамі, хто вякамі паліваў яе сваім потам і крою. Так, беларускі народ, вызвалены доблеснай Чырвонай Арміяй, пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, ажыццявіў многавяковую мару аб вызваленні ад іга памешчыкаў, мару аб зямлі.

З гэтага часу на свабоднай зямлі няма і не будзе месца паразітам-памешчыкам і іх пасобнікам. З гэтага часу сялянства Заходняй Беларусі назаўсёды збаўлена ад голаду, галечы і разарэння.

Гэтых дасягненняў дабіліся народы Заходняй Беларусі пры Совецкай уладзе, кіруемай большэвіцкай партыяй.

Хто імкнецца да таго, каб наша сялянства было назаўсёды забяспечана ад небяспекі галечы і голаду, хто хоча, каб паспяхова перабудоўвалася жыццё беларускага сялянства, збаўленага ад іга памешчыкаў і капіталістаў, той будзе галасаваць за партыю большэвікоў, той будзе галасаваць за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Перамога соцыялізма ў СССР забяспечыла карэннае паляпшэнне становішча працоўных. У кожнай капіталістычнай дзяржаве заўсёды ёсць велізарная маса беспрацоўных. Матэрыяльная незабяспечанасць, няўпэўненасць у заўтрашнім дні, галеча былі пастаяннай доляй рабочага класа Заходняй Беларусі пад ігам панскай Польшчы. У краіне Советаў назаўсёды знішчана беспрацоўе. За шэсць месяцаў Совецкай улады ў заходніх абласцях Беларусі ўжо ў асноўным ліквідавана беспрацоўе.

Хто імкнецца да таго, каб працоўныя нашай краіны былі і надалей збаўлены ад якога-б там ні было беспрацоўя і няўпэўненасці ў заўтрашнім дні, хто хоча далейшага паляпшэння матэрыяльна-бытавога становішча рабочых і служачых, той будзе галасаваць за партыю большэвікоў, той будзе галасаваць за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Да перамогі Вялікай Соцыялістычнай рэволюцыі цяжкае і бязрадаснае было жыццё жанчын. Жанчына была на становішчы хатняй рабыні. Пазбаўленая ўсялякіх палітычных правоў, яна аставалася непісьменнай і адсталай. Толькі ў выніку перамогі Соцыялістычнай рэволюцыі жанчына стала поўнапраўнай грамадзянкай, свабодным членам працоўнай сям'і. Сёння беларуская жанчына нароўні з мужчынам будуе соцыялізм, удзельнічае ў кіраўніцтве дзяржавай, прыкладае свае сілы і здольнасці ва ўсіх галінах чалавечай дзейнасці. За годы рэволюцыі многа жанчын вырасла да буйных дзяржаўных дзеячоў. Многія з іх выбраны ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Толькі ў нашай краіне жанчыне забяспечана шчаслівае і раднасае мацярынства, толькі ў нашай краіне права мацеры і дзіцяці ахоўваецца совецкім законам. Як у горадзе, так і ў вёсцы Совецкая ўлада стварае ўсе ўмовы для культурнага і палітычнага росту жанчыны. Вучонымі, інжынерамі, тэхнікамі, кіраўнікамі прадпрыемстваў і ўстаноў, старшынямі калгасаў, брыгадзірамі, трактарыстамі, камбайнерамі, аграномамі, урачамі, настаўнікамі, ва ўсіх галінах тэхнікі, навукі, культуры, у прамысловасці, сельскай гаспадарцы працуюць жанчыны.

Кончылася бяспраўе і прыгнечанне беларускай жанчыны ў вызваленых заходніх абласцях Беларусі, адкрылася шырокая дарога на шляху да новага шчаслівага жыцця. Навекі ў мінулае адышло бяспраўнае жыццё, пачалося новае жыццё совецкай жанчыны. Шчаслівага і радаснага жыцця жанчыны дабіліся толькі дзякуючы Совецкай уладзе, кіруемай партыяй большэвікоў.

Хто хоча, каб і надалей жыццё совецкай жанчыны было шчаслівым і радасным, той будзе галасаваць за партыю большэвікоў, той будзе галасаваць за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Царская Расія была турмой народаў, краінай нацыянальнага прыгнёту. Толькі у Совецкім Сюзе раней прыгнечаныя народы дабіліся поўнага вызвалення ад нацыянальнага прыгнёту і няроўнасці. Ліквідавана ўзаемнае недавер'е паміж народамі. Адносіны народаў будуюцца на пачатках узаемнага давер'я, брацкага саюза і прыяцельскага супрацоўніцтва.

За годы Совецкай улады, дзякуючы правядзенню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, Совецкая Беларусь з дапамогай брацкіх народаў СССР і, у першую чаргу, з дапамогай вялікага рускага народа, з забітай, адсталай, некультурнай, з краіны галечы і бяспраўя і нацыянальнага прыгнечання, ператварылася ў роўную сярод роўных квітнеючую соцыялістычную рэспубліку, неаддзялімую частку вялікага Совецкага Саюза.

Вызвалены народ заходніх абласцей з'еднан у адзіную дружную сям'ю шчаслівых народаў краіны соцыялізма. Працоўныя заходніх абласцей — беларусы, палякі, яўрэі, рускія і іншыя, — упершыню набылі сваю дзяржаўнасць, набылі сваю сапраўдную радзіму.

Уведзена бясплатная асвета. За некалькі месяцаў Совецкай улады ў кожнай вобласці адкрыты сотні новых школ, у якіх навучаюцца дзесяткі тысяч дзяцей. Адкрыта чатыры вышэйшых навучальных установы, шэсць педагагічных вучылішчаў, некалькі тэхнікумаў. Совецкая ўлада гэтым ажыццяўляе права на асвету, запісанае ў Сталінскай Канстытуцыі.

Уведзена бясплатнае лячэнне, адкрыты дзесяткі новых бальніц. Адкрыты сотні клубаў і дамоў соцкультуры, тэатры, кіно, радыё, газеты, бібліятэкі, — усё гэта стала здабыткам народа. Народы заходніх абласцей Беларусі вышлі на шырокую дарогу да шчаслівага і радаснага жыцця.

Усяго гэтага вызвалены народ дабіўся дзякуючы Совецкай уладзе, пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў.

Хто жадае далейшага ўмацавання дружбы народаў СССР, поўнай палітычнай роўнасці народаў, той будзе галасаваць за партыю большэвікоў, той будзе галасаваць за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Наш народ пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі разграміў ворагаў народа — шпіёнаў, дыверсантаў і шкоднікаў. Мірная палітыка, праводзімая нашым урадам выкрыла імперыялістычныя задзеі капіталістычных драпежнікаў, збавіла нашу краіну ад новай імперыялістычнай вайны. Забяспечана мірная праца і творчае жыццё нашага народа. Пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў створана наша доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот, узброеная сіла соцыялістычнай дзяржавы, якая пакрыла сябе неўміручай славай у баях у годы грамадзянскай вайны, у баях ля возера Хасан, у раёне Халхін-Гола, выконваючы вызваленчую місію на палях Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Дзякуючы слаўным подвігам геройскай Чырвонай Арміі, забяспечана беспапаснасць Паўночна - Заходняй граніцы СССР і горада Леніна, яшчэ раз перамагла мірная палітыка СССР, разбураны планы падпальшчыкаў вайны ў Фінляндыі.

Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот, аснашчоныя самай перадавой ваеннай тэхнікай, абапіраючыся на згуртаванасць на маральна-палітычнае адзінства нашага народа, кіруемыя партыяй большэвікоў, сталі несакрушальнай сілай, гразой для імперыялістычных падпальшчыкаў вайны. І ўсякі, хто пасмее напасці на нашы граніцы, будзе знішчан.

Але трэба памятаць, што барацьба яшчэ не закончана і небяспека нападу імперыялістычных драпежнікаў яшчэ не мінавала. Астаткі разбітых эксплаататарскіх класаў будуць імкнуцца пашкодзіць нашаму паступальнаму руху да поўнага завяршэння соцыялізма ў нашай краіне. Трэба памятаць, што імперыялістычныя драпежнікі будуць імкнуцца навязаць нам вайну, будуць засылаць шпіёнаў, дыверсантаў і шкоднікаў у нашу краіну. У прадстаячых выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР астаткі эксплаататарскіх класаў, верныя слугі былой польскай дзяржавы, польскіх памешчыкаў і капіталістаў, агенты і правакатары замежных разведак усяляк будуць перашкаджаць паспяховаму правядзенню выбараў.

Мы ні на мінуту не павінны забываць указання таварыша Сталіна аб тым, што «пакуль існуе капіталістычнае акружэнне, будуць існаваць у нас шкоднікі, дыверсанты і забойцы, засыламыя ў наш тыл агентамі замежных дзяржаў».

Хто імкнецца да таго, каб працоўныя СССР карысталіся і надалей дабротамі мірнай працы, хто хоча свабоды і незалежнасці нашай радзімы, той будзе галасаваць за партыю большэвікоў, той будзе галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Такавы дасягненні нашай радзімы за годы рэволюцыі, якіх дабіўся вялікі народ нашай вялікай краіны. Такавы справы і вынікі барацьбы партыі большэвікоў, у якой слова ніколі не разыходзіцца са справай і абяцанні ніколі не ператвараюцца ў пусты гук.

Вось чаму Цэнтральны Камітэт Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Беларусі спадзяецца на поўнае давер'е ў прадстаячых выбарах, спадзяецца, што выбаршчыкі будуць аднадушна галасаваць за кандыдатаў Сталінскга блока комуністаў і беспартыйных.

Таварышы выбаршчыкі!

У выніку выбараў да кіраўніцтва і ўпраўлення дзяржавай прыдуць сотні новых людзей, будуць выбраны самыя лепшыя сыны і дочкі працоўнага народа. Працоўныя вылучылі кандыдатаў у вышэйшыя органы дзяржаўнай улады сапраўды народных прадстаўнікоў, якія будуць стойкімі і адданымі справе народа людзьмі. Задача заключаецца ў тым, каб выбаршчыкі дружна галасавалі за іх. Галасуючы за вылучаных кандыдатаў, выбаршчык павінен памятаць, што ён галасуе за тую палітыку, якую праводзіць Совецкая ўлада і партыя большэвікоў, за тую палітыку, якую абавязваюцца праводзіць вылучаныя кандыдаты.

Вылучаныя кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР у сваёй большасці людзі, якія не маюць вопыту кіраўніцтва дзяржавай. Гэта не павінна быць прычынай іх нявыбрання. Асаблівасці совецкага ладу ў тым іменна і заключаюцца, што ён забяспечвае быстры рост людзей, іх здольнасцей, іх талентаў, што ўчора яшчэ малавядомыя людзі могуць стаць у кароткі тэрмін грамадскімі дзеячамі, заслугоўваючымі ўсеагульнага давер'я.

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Беларусі заклікае ўсіх выбаршчыкаў з'явіцца, усім як адзін, 24 сакавіка 1940 года да выбарчых урнаў для выбараў дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР і Вярхоўны Совет БССР.

Не павінна быць ніводнага выбаршчыка, які-б не скарыстаў свайго пачотнага права — выбіраць дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР і Вярхоўны Совет БССР.

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі заклікае ўсіх выбаршчыкаў, комуністаў і беспартыйных, дружна, як адзін, галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Усе на выбары!

Няхай жыве і мацнее наша магутная радзіма — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

Няхай жыве наша Совецкая Соцыялістычная Канстытуцыя!

Няхай жыве саюз рабочых і сялян!

Няхай жыве саюз комуністаў і беспартыйных у прадстаячых выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР!

Няхай жыве з'едначы беларускі народ!

Няхай жыве Совецкая ўлада!

Няхай жыве Ўсесаюзная Комуністычная Партыя (большэвікоў)!

Няхай жыве наш родны бацька, друг і настаўнік, наш правадыр — таварыш СТАЛІН!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў) БЕЛАРУСІ.

24 САКАВІКА — ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР і БССР

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ПА 357 ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

Іван Вікенцьевіч Ігнатовіч

(Біяграфічны нарыс)

Сярэдняга росту, з маршчынамі на твары, хоць і не зусім стары гадамі Іван Вікенцьевіч Ігнатовіч. Нарадзіўся ён у 1896 годдзе. Паднявольнае жыццё, поўгалоднае існаванне, шматгадовыя пошукі заработкаў раней часу высмакталі сілы і маладосць Івана Вікенцьевіча.

Селянін вёскі Студзенка, у сям'і якога нарадзіўся Іван Вікенцьевіч, да 1907 года зусім не меў зямлі. Сродкам існавання самога Вікенція Ігнатовіча і яго сям'і ў 8 душ была плотніцкая работа. Мізэрнага заработку бацькі далёка не хапала нават на харчаванне сям'і, а аб вучобе дзяцей Вікенцій не мог і думаць. Таму зусім малым хлопчыкам Іван вымушан быў пайсці разам з бацькам здабываць сабе хлеб, вучыцца плотніцкай рабоце і дапамагаць бацьку ў яго цяжкай працы.

Наступіла першая імперыялістычная крывавая бойня. Сотні тысяч працоўных пакідалі свае дамы, свае паселішчы. Для Івана Вікенцьевіча гэты перыяд з'явіўся самым пакутным. У 15 гадовым узросце, адбіўшыся ад роднай сям'і, прышлося аднаму поўраздетаму і галоднаму прабірацца ў глыб Расіі.

Пасля доўгіх мытарстваў 3 лістапада 1915 года тав. Ігнатовіч паступіў працаваць на Мурманскую чыгунку, але не надоўга. 26 сакавіка захварэў цынгой. Трэба было перамяніць месца, і ён пешкам адзін прабіраўся праз замёрзшыя Ладажскае і Онежскае азёры і лясы і прыбыў у Петраград.

Адчуў і перанёс на сваёй спіне Іван Вікенцьевіч усе здзекі і муштру афіцэраў царскай арміі. З 15 мая 1916 года да канца імперыялістычнай вайны служыў у царскай арміі. Пасля лютаўскай рэволюцыі, як лепшага таварыша, салдаты абралі Івана Вікенцьевіча старшынёй ротнага камітэта. Па дэмабілізацыі паўночна-заходняга фронта зволіўся з арміі і ў 1920 годзе прыбыў да роднай сям'і.

Зварочваючыся дамоў, тав. Ігнатовіч меркаваў, што жыццё палепшыцца, але атрымалася адваротнае. Зноў пацягнуліся доўгія 20 з лішнім год здзекаў і пакут. Паявілася сям'я, падрасталі дзеці. З сваёй гаспадаркі ў тры гектары пясчанай зямлі, з якой трэцяя частка заўсёды пуставала, хлеба хапала для 8 душ сям'і толькі на тры-чатыры месяцы. Але і зарабіць не было дзе. У лес і на іншыя работы не прымалі падрадчыкі, бо ў Івана Вікенцьевіча не было з чаго даць хабар.

Не мог мірыцца і не мірыўся Ігнатовіч з існаваўшым ладам. Затаіўшы ў сэрцы кіпучую нянавісць да ворагаў, чакаў ён зручнага моманту адпомсціць катам. Вестка аб брацкай дапамозе вялікага народа краіны соцыялізма ашчаслівіла і абрадавала Івана Вікенцьевіча. Па прыходзе Чырвонай Арміі ён з галавой акунуўся ў грамадскую работу. Працуе ў рабоча-сялянскай гвардыі спачатку радавым, а потым начальнікам і адначасова намеснікам старшыні сельскага камітэта, дапамагае Чырвонай Арміі хутчэй ліквідаваць астаткі банд польскіх афіцэраў. У час выбараў дэпутатаў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі тав. Ігнатовіч працуе намеснікам старшыні ўчастковай выбарчай камісіі.

Даведаўшыся аб жыцці калгаснага сялянства ўсходніх абласцей БССР, Ігнатовіч пачаў работу ў вёсцы Студзенка па арганізацыі калгаса. Знайшоў прыкладны статут сельска-гаспадарчай арцелі і вывучыў яго з аднавяскоўцамі, і праз некаторы час 26 гаспадарак вёскі аб'ядналіся ў калектыўную гаспадарку і выбралі тав. Ігнатовіча намеснікам старшыні праўлення калгаса.

Зараз Іван Вікенцьевіч працуе старшынёй Студзенскага сельсовета. Сяляне сельсовета выканалі план загатовак лесу, прадалі лішкі сельгаспрадуктаў дзяржаве і ўзмоцнена рыхтуюцца да першай совецкай вясны.

Адданую работу на карысць народа і соцыялістычнай краіны тав. Ігнатовіча заслужана ацанілі выбаршчыкі 357 Васількоўскай выбарчай акругі, вылучыўшы яго сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. І ва ўсенароднае свята—дзень 24 сакавіка яны ўсе, як адзін, аддадуць свае галасы за вернага сына беларускага народа, за кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за Івана Вікенцьевіча Ігнатовіча.

Д. Казлоў.



Агітатар 5-га ўчастка чыгуначнай выбарчай акругі г. Беластока, хатняя гаспадыня тав. Гур'янава (злева) праводзіць гутарку аб выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР у сям'і рабочага—рымарніка Ф. А. Астаповіча. (Фотахроніка БЕЛТА).

ВЫБАРЧЫ ЎЧАСТАК І ЗАВОД

Установлены на корпусе фанернага завода пражэктар вечарамі ярка асвятляе прыгожа аформленую гербам БССР, партрэтамі і лозунгамі браму, вядучую ў клуб, дзе знаходзіцца выбарчы ўчастак № 48 Чырвонаармейскай выбарчай акругі.

Амаль штодзённа на ўчастку праводзяцца масавыя мерапрыемствы. Даклады аб выбарчым законе, лекцыі аб Канстытуцыі, даклады аб міжнародным становішчы і многа іншых лекцый і дакладаў. Вечары заканчваюцца канцэртамі і кіносеансамі.

— Тав. Мазо, — звяртаецца толькі што ўвайшоўшы выбаршчык да даверанага, — сёння што будзе?

— Сёння вечар, прысвечаны 69 гадавіне Парыжскай Комуны,—адказвае даверany.

— А кінокарціна будзе? — ўмешваецца дзяўчына.

— Будзе, будзе, — з усмешкаю адказвае тав. Мазо.

У пакой уваходзяць усё новыя і новыя выбаршчыкі. Больш 200 чалавек прышлі на ўчастак. Пачаўся даклад. Выбаршчыкі ўважліва слухаюць прамоўцу. У пакоях цішыня.

* * *

48 выбарчы ўчастак гэта ў асноўным рабочы раён. Тут жывуць многія рабочыя фанернага завода. Таму партыйная арганізацыя ўвязвае перадвыбарчую агітацыю з вытворчым уздымам на заводзе. З кожным днём завод паляпшае сваю работу. Месяц назад рабочыя месцы былі завалены, пад нагамі ўсюды валяліся абрыўкі фанеры. Нічога падобнага зараз. Рабочыя месцы ачышчаны і прыведзены ў парадак. Расце прадукцыйнасць працы. Вось некалькі лічбаў. 11 сакавіка завод даў 42,899 кубаметра фанеры, 12 сакавіка — 45,554 кбм, 13 сакавіка — 46,676, 14 сакавіка—48,509 кубаметра.

Сакратар партгрупы завода, ён-жа даверany ўчастка тав. Мазо аддае многа ўвагі рабоце з агітатарамі. Праводзяцца частыя семінары. Іх праводзяць дырэктар завода тав. Шчэгалюцін і тав. Мазо.

Многа дапамагаюць рабоце з выбаршчыкамі шэфы з Н-скай часці. Яна дапамагла ў мастацкім афармленні ўчастка, дала нямала агітатараў, часта прысылае дакладчыкаў і арганізуе кіносеансы на ўчастку. Чырвонаармейцы і рабочы калектыў завода дружнай работай забяспечаць тое, што ў дзень 24 сакавіка ўсе выбаршчыкі з'явяцца да выбарчых урнаў і аддадуць свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

І. Каралькоў.

Абласная нарада сялян

Выступленне тав. Трушкевіча

(Старшыня калгаса «Чырвоны агароднік», Мінскага раёна)

Таварышы сяляне і сялянкі Беластоцкай вобласці, дазвольце ад імені калгаснікаў Мінскай вобласці перадаць вам гарачае прывітанне **(бурныя апладысменты)**. Наш калгас „Чырвоны агароднік", размешчаны ў цэнтры рэспублікі, каля горада Мінска, мае парніковую гаспадарку, якая забяспечвае горад ранняй гароднінай, мае таксама малочна - таварную ферму ў колькасці 100 галоў, мае свінатаварную і аўцагадоўчую фермы, 6000 парніковых рам. У нас 50 гектараў гародаў і вялікія зернавыя палі. У першы год, калі калгас арганізаваўся, мы мелі нізкі ўраджай зернавых — 6—7 цэнтнераў. На сёння мы маем па ўсяму калгасу ўраджай 15,8 цэнтнера зернавых з гектара, бульбы 180 цэнтнераў, гародніх культур 600 і больш цэнтнераў з гектара. Мы далі абавязацельства ў 1940 годзе сабраць бульбы 250 цэнтнераў з гектара.

Таварыш Сталін аддае калгасам выключна вялікую ўвагу. На першай нарадзе перадавікоў-калгаснікаў калгаснікі задалі яму пытанне: таварыш Сталін, скажыце, што нам трэба для таго, каб мы жылі багатымі і заможнымі? Таварыш Сталін адказаў вельмі кароткімі словамі. Ён гаворыць: таварышы калгаснікі, цяпер мы вам прадаставілі ўсю зямлю, тэхніку, якой не мае ні адна капіталістычная краіна. Цяпер чарга за вамі. Вы павінны ўсе чэсна працаваць, каб было багацце прадуктаў.

Наш калгас у 1939 годзе ўдзельнічаў ва Ўсесаюзнай сельска-гаспадарчай выстаўцы. 27 калгаснікаў перадавікоў былі ўдзельнікамі выстаўкі. Галоўвыстаўком выдаў нашаму калгасу прэмію ў 10.000 рублёў, першы прыз і легкавую машыну. У раёне мы былі занесены на дошку пачоту, атрымалі таксама 10.000 рублёў і грузавую аўтамашыну. Кожнага з нас, удзельнікаў выстаўкі, індывідуальна ўзнагародзілі веласіпедамі.

У 1939 годзе мы папрацавалі так, як належыць большэвікам. Наш калгас атрымаў прыбытку 2 мільёны 25 тысяч рублёў. Мы атрымалі на працадзень бульбы 17,6 кілограма, хлеба 1200 грамаў і грашыма 9 рублёў 81 кап.

Калгас наш электрыфікаван усе калгаснікі маюць радыё, большасць маюць патэфоны, веласіпеды. Мы маем пярвічную партарганізацыю, комсамольскую арганізацыю. Моладзь актыўна ўдзельнічае ў калгасным будаўніцтве.

Жадаю вам, таварышы, у скорым будучым ажыццявіць такое-ж радаснае і шчаслівае жыццё, якое ажыццявілі мы. **(Апладысменты)**.

Выступленне тав. Антанюк

(Бранскі раён)

Таварышы, 20 год чакалі мы прыходу совецкай улады. 20 год нас прыгняталі. Цяпер, выгнаўшы памешчыкаў і стаўшы гаспадарамі сваёй зямлі, мы павінны старацца працаваць чэсна. Мы павінны добра падрыхтавацца да вясенняй сяўбы. Па прыездзе дамоў мы павінны, не адкладваючы надоўга, узяцца за работу У нас ужо арганізованы абозы па ачыстцы насення.

У нашым сельсовеце ёсць 194 пагарэльцы, чые дамы згарэлі ў час вайны. Многім трэба будзе дапамагчы ў пасеўнай кампаніі. І мы гэта павінны зрабіць, каб уся зямля была засеяна.

Некаторыя кулакі гавораць, што сеяць не будуць. Я прапаную тут, што тых, якія не захочуць сеяць, трэба прымусіць, а калі яны не хочуць, то трэба будзе забраць іх зямлю. Зямля пуставаць не павінна.

У радзе вёсак у нас не хапае вугалю для кузняў. Трэба будзе самім сялянам зарганізаваць выпальванe вугалю, хоць-бы самым прымітыўным способам, каб кузні не стаялі. З жалезам таксама справа абстаіць не вельмі добра. Але ў нас ёсць жалеза, якое ляжыць задарма ў розных кутках. Гэта жалеза неабходна адшукаць і скарыстаць для справы. Калі мы сур'ёзна возьмемся за работу, мы зможам перамагчы ўсе цяжкасці, якія нам сустрэнуцца.

Калі мы раней працавалі для кулакоў, то цяпер мы будзем працаваць для сябе саміх і для агульнага дабра.

Няхай жыве Чырвоная Армія!

Няхай жыве правадыр Чырвонай Арміі таварыш Варашылаў!

Няхай жыве правадыр усіх працоўных усяго свету таварыш Сталін! **(Апладысменты)**.

Парыжская комуна

Вялікі вобраз Комуны, як перадавога барацьбіта за соцыяльную рэволюцыю, барацьбіта за вызваленне ўсяго працоўнага чалавецтва, будзе жыць у вяках.

Маркс у сваёй палкай адозве да членаў Першага Інтэрнацыянала пісаў: „Парыж рабочых з яго Комунай заўсёды будуць шанаваць як слаўнага прадвесніка новага грамадства. Яго мучанікі навекі запалі ў вялікім сэрцы рабочага класа. Яго катаў гісторыя ўжо цяпер прыбіла да таго ганебнага слупа, ад якога іх не ў сілах будуць вызваліць усе малітвы іх папоў".

Комунары Парыжа, паміраючы на барыкадах, завяшчалі міжнароднаму пролетарыяту высока трымаць сцяг пролетарскай рэволюцыі, змагацца за ўстанаўленне рабочай улады, за дыктатуру пролетарыята.

69 год прайшло з часу абвяшчэння Парыжскай Комуны. 18 сакавіка 1871 года адбылася небывалая ў гісторыі падзея. Урад Т'ера ўцёк са сваімі войскамі, паліцыяй і чыноўнікамі. Гаспадаром становішча стаў народ. Улада перайшла ў рукі пролетарыята.

18 сакавіка 1871 года парыжскі пролетарыят вышаў на вуліцу. Ён падняў сцяг паўстання. Рабочая рэволюцыя 18 сакавіка непадзельна авалодала Парыжам. Часовым рэволюцыйным урадам Парыжа стаў Цэнтральны Камітэт нацыянальнай гвардыі, батальёны якой пераважна складаліся з рабочых. Гэта была першая рэволюцыя, у якой рабочы клас быў адкрыта прызнан адзіным класам, здольным да грамадскай ініцыятывы. Гэта прызналі нават шырокія слаі парыжскага сярэдняга класа.

28 сакавіка 1871 года Цэнтральны Камітэт перадаў свае ўрадавыя функцыі дэмакратычна выбранай насельніцтвам Парыжа Комуне, якая складалася ў большасці з працоўных. Комуна была, па сутнасці, урадам рабочага класа, вынікам барацьбы супроць паразітычнай меншасці, супроць эксплаататараў.

З першага моманту свайго існавання Комуна схіліла да сябе любоў народа і лютую нянавісць усіх паразітычных элементаў Францыі. Толькі рабочыя асталіся да канца верныя Комуне. Буржуазныя рэспубліканцы і дробныя буржуа скора адыйшлі ад Комуны, але гэта не спыняла гераічных комунараў, якія штурмавалі капіталізм. „Толькі французскія пролетарыі без страху і сгамлення падтрымлівалі свой урад, толькі яны змагаліся і паміралі за яго, гэта значыць за справу вызвалення рабочага класа, за лепшую будучыню для ўсіх працоўных" (Ленін). Велічная і незабыўная заслуга комунараў перад усім працоўным чалавецтвам. Яны зрабілі першую спробу зламаць, разбіць старую дзяржаўную, бюракратычную машыну, гэту зброю прыгнечання і падаўлення народа.

Комуна замяніла старую армію ўзброенымі рабочымі, арганізованымі ў батальёны Нацыянальнай Гвардыі. Яна ўстараніла паліцыю, аддзяліла царкву ад дзяржавы, чым нанесла моцны ўдар „жандарам у расах". Была ўстаноўлена новая сістэма дзяржаўнай улады — Комуны.

У галіне соцыяльных мерапрыемстваў Комуна не паспела зрабіць многага. Але ўжо тое, што яна зрабіла, ярка паказвае яе характар народнага, рабочага ўрада. Яна адмяніла начную працу ў булачных, ліквідавала сістэму штрафаў, выдала славуты ўказ, па якім фабрыкі, заводы і майстэрні, кінутыя капіталістамі, перадаваліся рабочым арцелям для аднаўлення работ. Асобныя праведзеныя мерапрыемствы ўказвалі, што Комуна развівалася ў соцыялістычным напрамку, што яна была той палітычнай формай, пры якой магло адбыцца вызваленне працы.

Памылкай Комуны з'явілася тое, што яна не павяла з самага пачатку рашучай барацьбы супроць контррэволюцыйнага версальскага ўрада, дала яму магчымасць сабрацца з сіламі, не здолела арганізаваць свае ўзброеныя сілы і органы для барацьбы з контррэволюцыяй. Вялікай памылкай Комуны было тое, што яна не нацыяналізавала дзяржаўны банк, а пакінула яго ў руках сваіх ворагаў. Прыспешнікі Т'ера вывозілі буйныя сумы грошай у Версаль для фінансіравання контррэволюцыі. Вялікадушша да ворагаў было адной з прычын пагібелі Парыжскай Комуны.

Сціснуты кальцом ворага, Парыж, які першы ўзняў сцяг пролетарскага паўстання, быў прадастаўлен уласным сілам. У некаторых буйных гарадах Францыі (Марселі, Ліоне, Сент-Эт'ене і інш.) рабочыя прабавалі захапіць уладу і пайсці на дапамогу Парыжу, але гэтыя спробы закончыліся няўдачай.

Комуна не здолела абаперціся на саюз пролетарыята з сялянствам, што таксама было прычынай яе паражэння.

Пасля 72 дзён свайго існавання Комуна пала. 21 мая пачаўся „крывавы тыдзень": аж да 28 мая квартал за кварталам распачліва абараняліся ад версальскіх войск, якія ўварваліся ў Парыж. Комуна гераічна абаранялася. Буржуазія жорстка распраўлялася з парыжскім пролетарыятам. Крывавыя каты бязлітасна забівалі рабочых без суда і следства, яны не шкадавалі ні старых, ні жанчын, ні дзяцей. Многіх цяжка раненых жыўём закапвалі ў магілу. У турме ля Рокет за адзін толькі дзень было забіта 1900 чалавек. Дакладны лік загінуўшых комунараў не ўстаноўлен, але ва ўсякім выпадку іх было не менш 30 тысяч. Кінуты ў турмы і накіраваны ў ссылку ў далёкія калоніі 38 тысяч чалавек. Сярод іх знаходзілася звыш тысячы жанчын і 650 дзяцей.

Як ні вялікі былі афяры Комуны, яны акупляюцца значэннем яе для далейшай барацьбы міжнароднага пролетарыята: „Комуна выклікала сімпатыі ўсюды, дзе пакутуе і змагаецца пролетарыят. Гром парыжскіх гармат разбудзіў спаўшыя глыбокім сном самыя адсталыя слаі пролетарыята і ўсюды даў штуршок да ўзмацнення рэволюцыйна - соцыялістычнай прапаганды. Вось чаму справа Комуны не памёрла, яна да гэтага часу жыве ў кожным з нас". (Ленін).

Комуна з'явілася правобразам дыктатуры пролетарыята, зародкавай формай совецкай улады. Таварыш Сталін, гаворачы аб рэспубліцы Советаў, як аб палітычнай форме, пры якой магчыма поўная перамога соцыялізма, пісаў: „Парыжская Комуна была зародкам гэтай формы. Совецкая ўлада з'яўляецца яе развіццём і завяршэннем".

На аснове вопыту Комуны, рускай рэволюцыі 1905 года і асабліва рэволюцыі 1917 года Ленін развіў указанні Маркса аб дзяржаве ў вучэнні аб Советах, як дзяржаўнай форме дыктатуры пролетарыята.

Працоўныя нашай радзімы пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна ўвасобілі гэта вучэнне ў жыццё ў вобразе Совецкай улады, несакрушальнага Совецкага Саюза — краіны перамогшага соцыялізма.

Таварыш Сталін, кіруючы вялікай справай соцыялістычнага будаўніцтва, далей развіў ленінскае вучэнне аб дыктатуры пролетарыята і Совецкай уладзе, зародкавай формай якой і з'явілася Парыжская Комуна.

Е. Кандэль.

ДЗЕНЬ ПАРЫЖСКАЙ КОМУНЫ — ДЗЕНЬ МОПР'а

РАСКАЗЫ АБ ЖЫЦЦІ Ў БЫЛОЙ ПОЛЬШЧЫ—ТУРМЕ НАРОДАЎ

★ ★ ★

ДВАЙНОЕ ВЫЗВАЛЕННЕ

(Успаміны былога палітзняволенага)

Гэта было ў цяжкія крывавыя для палітзняволеных 1932—1933 годы. Гэта былі годы катавання і смерці.

У Грудзенскай турме знаходзілася каля 200 палітзняволеных. Набліжалася 18 сакавіка—гадавіна Парыжскай Комуны. Святкаваць гэты дзень, дзень МОПР'а, пастанавіла Грудзенская комуна. Рознымі спосабамі пад прыкрыццем цёмнай ночы ўдалося пераслаць з камеры ў камеру тэзісы аб Парыжскай Комуне.

Вечар 17 сакавіка. У камерах ля сталоў расселіся палітзняволеныя. Дакладчык гаворыць ціха. Сэрца кожнага перапоўнена пашанай да гераічных змагароў за ўладу пролетарыята—герояў Комуны.

Раніца 18 сакавіка. На грудзях у кожнага чырвоная стужка. Прышоў час снедання, але яшчэ не атрымалі кавалак чорнага хлеба і чорнай горкай нібыта кавы. На карыдорах чуваць шум, цяжкія крокі. Сценны тэлеграф паведамляе: «Турэмныя дазорцы сілай зрываюць чырвоныя стужкі».

Адчыняюцца дзверы нашай камеры. Уваходзяць дзесяткі азвярэлых дазорцаў, якія гвалтоўна зрываюць чырвоныя стужкі. Кожны з нас у твар бандытам кідае пратэст.

Час прагулкі. Ідзём двойкамі. Праз хвіліну ўсе ўпрыгожваюць сваю вопратку чырвонымі стужкамі. Турэмшчыкі камандуюць—сыйсці з прагулкі. Мы гэтага не выконваем. І вось турэмшчыкі гвалтоўна цягнуць таварыша Віктара Розеншэйна ў камеру. На карыдоры яго б'юць. Ён пратэстуе. Гучаць сотні галасоў: «Далоў катаванне палітычных зняволеных!» На вуліцы, каля турмы збіраюцца сотні рабочых, жанчын і дзяцей. Яны таксама пратэстуюць супроць катавання іх блізкіх. Конная паліцыя іх разганяе.

Так мы святкавалі міжнароднае свята салідарнасці — дзень 18 сакавіка ў жудасных засценках панскай Польшчы.

* * *

Сёлета ўпершыню мы ў залах, упрыгожаных партрэтамі любімых правадыроў комуністычнай партыі, будзем святкаваць 18 сакавіка — дзень МОПР'а. Мы будзем яго святкаваць з двайной радасцю, бо наша вызваленне двайное: вызвалілася з-пад іга капіталізма наша краіна і мы вызваліліся з турэмных акоў.

М. Гелер.

У КАТОЎНІ КАРТУЗ-БЯРОЗЕ

(Успаміны былога палітзняволенага)

У Картуз-Бярозу наш «транспарт» прышоў ноччу. У канцыляры́і нас падзялілі па пяцёрках і да кожнай прыставілі канвой з пяцярых паліцэйскіх. Павялі. Трэба было прайсці якіх-небудзь сто метраў да другога корпуса. Як толькі ступілі мы некалькі шагоў, на нас пасыпаўся град удараў гумавымі палкамі. Білі па галаве і спіне. Я адчуў, як мая кашуля прыліпла да цела, змяшалася з крывёй, а гумавыя палкі працягвалі нанасіць ўдары.

4 гадзіны раніцы. Нас разбудзіў пранізваючы свісток. Пасля «снедання», да якога ніхто не прыкрануўся, нас выгналі на двор, паставілі радамі і павялі на «работу». Далі ламаныя лапаты. Паставілі ў шарэнгу і пачалі біць. Мы капаем — яны б'юць. Прамоклі да мозга косцей, ногі падкашваюцца. Мы капаем—яны б'юць. Кагосьці поўмёртвага, без прызнакаў жыцця, спэцканага граззю, працягнулі каля нас. Адзін за другім людзі падаюць у непрытомнасць. Паліцэйскія топчуць іх нагамі, «прыводзяць» у прытомнасць палкамі. У адзін з такіх дзён быў замучан на смерць яўрэйскі паэт Германіцкі, а ў другі—быў зверскі забіты беларускі селянін Мозырка.

Здзекам не было канца. На барану з пакрыўленымі зубамі ўзвалілі вялікія камні, прывязалі да яе вяроўку. Чатырох нас запраглі замест коней. Двое коней не кранулі-б з месца гэтай бараны, але мы, чацвёра беразакоў, цягнулі яе па полі. Вочы імкнуцца выскачыць з арбіт, з рота выбіваецца пена, почкі і лёгкія адбіты, губляеш прытомнасць. Але пад гікам катаў і свістам гумавых палак бяжыш, задыхаючыся.

Паліцэйскі Звяркоўскі адзін раз увесь дзень біў мяне палкай, а калі гэта яму надакучыла, ён выразаў лазовы прут і з усёй лютасцю сек ім мяне. Аднак і гэта не задаволіла садыста. Непадалёку зняволенымі была выкапана глыбокая яма для звалкі смецця. Звяркоўскі сілай загнаў мяне ў яму. Быццам у сне, я адчуваў, як на мяне сыпалі зямлю. Я адчуў моцны ўдар па твары. У роце стала салона, у вачах пачарнела. Ачуняў я, седзячы на траве, і ледзь жывы быў прымушан зноў узяць граблі і рабіць зусім непатрэбнае, зграбаць апаўшае з дрэў лісце.

У такіх умовах прышлося правесці 19 месяцаў жыцця ў катоўні Картуз-Бярозе.

Ш. Жырман.

ДА ДНЯ ПАРЫЖСКАЙ КОМУНЫ



У апошні бой (1871 г). (Фота-клішэ ТАСС).

Выхоўваць працоўных у духу інтэрнацыяналізма

Арганізацыя МОПР'а нашага тэкстыльнага камбіната існуе ўсяго тры месяцы. Цяпер наша ячэйка налічвае 500 членаў. З 12 двухстаночнікаў 11 з'яўляюцца членамі МОПР'а. Двухстаночнікі таварышы Асавіцкі і Скрандэ першымі на камбінаце заключылі паміж сабой дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва, у якім абавязаліся выконваць вытворчыя заданні на 120 проц.

На камбінаце створаны тры мопраўскія куткі. Цэхі камбіната ўпрыгожаны лозунгамі. 16 членаў ячэйкі МОПР выпісваюць журнал «Інтэрнацыянальны маяк». Ва ўсіх цэхах вылучаны зборшчыкі членскіх узносаў. Сіламі мопраўскага актыва ў цэхах праводзяцца гутаркі па міжнародных пытаннях. Заключан дагавор на соцспаборніцтва паміж намі і ячэйкай МОПР'а 2-га тэкстыльнага камбіната. Мы свае абавязацельствы ўжо выканалі.

У лютым месяцы правялі першы інтэрнацыянальны вечар. Выпусцілі першы нумар насценнай газеты «Моправец 3-га камбіната».

Члены ячэйкі МОПР актыўна ўключыліся ў выбарчую кампанію. Звыш 30 актывістаў працуюць агітатарамі, членамі акруговых і ўчастковых камісій. Намі на 91 выбарчым участку створан мопраўскі куток і выпушчана насценная газета «Красная выгода».

Мы актыўна рыхтаваліся да дня МОПР'а—18 сакавіка. Агітатары тт. Рабін, Наер, Перэльман, Асавіцкі і інш. у цэхах правялі гутаркі. Упрыгожылі цэхі, падрыхтавалі інтэрнацыянальны вечар і выпусцілі другі нумар насценнай газеты.

Галоўнай задачай цяпер з'яўляецца ўцягненне мопраўцаў у актыўную грамадскую і вытворчую работу, узмацненне інтэрнацыянальна-выхаваўчай работы сярод рабочых і служачых камбіната. А ў гэтай галіне роля МОПР'а надзвычайна вялікая. Наша задача выкарчаваць спадчыну праклятага мінулага, праявы нацыяналізма і шавінізма, несці ў асяроддзе рабочых вялікія сталінскія ідэі—дружбу народаў, брацкае супрацоўніцтва. Добра пастаўленая работа МОПР пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі забяспечыць яшчэ большае згуртаванне працоўных вакол вялікай партыі Леніна—Сталіна.

С. Еліна,
старшыня ячэйкі МОПР 3-га тэкстыльнага камбіната.

Дапаможам братам, зняволеным у краінах капітала

Падвал Серацкай турмы меў многа карцараў. Падлога каменная, сцены вільготныя, аконцы пры самай зямлі. Вядро ў кутку пастаянна цякло. А карцары былі заўсёды перапоўнены зняволенымі.

Кожны пратэст суправаджаўся пакараннем: сем дзён карцара і праз дзень пост. Дэлегаткі-ж мелі бестэрміновы карцар, што называлася ізаляцыяй, на якой можна было прабыць дзень, тыдзень і год. Пяцёра нас было на ізаляцыі. Сядзелі ўжо сем тыдняў. Адзіная сувязь з комунай — стуканне ў сцены. Размераныя ўдары гучаць, як голас. Перадаюць, што ў час забастоўкі рабочыя прынялі рэзалюцыю аб абароне палітзняволеных. Ведаем — гэта арганізаваў МОПР. Як гэта добра, што да глухіх падвалаў турмы даходзяць водгукі з свабоды! Ізаляцыя перастае дакучаць, забываецца холад і голад. Ведаем, што аб нас думаюць. Гэта гартуе.

* * *

Мы, цяпер свабодныя, шчаслівыя, будзем усямерна дапамагаць нашым братам па барацьбе, зняволеным у краінах капітала.

Бела Фрыш.

★ ★ ★

РАСТУЦЬ МОПРАЎСКІЯ РАДЫ

Мопраўская арганізацыя Беластоцкай області расце і пашыраецца з кожным днём. Работа МОПР'а мацнее на фоне яшчэ жывых успамінаў аб праклятым мінулым, варварскім прыгнечанні, пад якім пакутвалі працоўныя Заходняй Беларусі.

Мы, атрымаўшыя свабоду, павінны дапамагчы тым, хто яшчэ знаходзіцца ў няволі—такі асноўны матыў бурлівага росту беластоцкай мопраўскай арганізацыі. Іменна таму з 710 рабочых 3-га суконнага камбіната 500—члены МОПР'а. 8 сакавіка работніцы гэтага камбіната дзве гадзіны працы аддалі ў фонд дапамогі ахвярам белага тэрору ў краінах капітала, а старая работніца-тэкстыльшчыца 17-й фабрыкі тав. Дэмбовіч, атрымаўшы за добрую работу прэмію, перадала яе ў карысць МОПР'а.

У канцы трэцяга месяца сваёй работы 10 тысяч членаў налічвае Беластоцкая арганізацыя МОПР. 200 мопраўскіх ячэек вядуць актыўную інтэрнацыянальна-выхаваўчую работу, пашыраюць стаханаўскі рух многастаночнікаў. Лепшыя актывісты МОПР'а праводзяць вялікую агітацыйную работу сярод насельніцтва, на выбарчых участках, каб забяспечыць бліскучую перамогу блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

У першых радах гэтай работы знаходзяцца 3-ці, 1-шы і 2-гі тэкстыльныя камбінаты, на якіх 50—60 процантаў усіх рабочых з'яўляюцца членамі МОПР'а. Тут праведзена некалькі дзесяткаў сходаў, дакладаў і інтэрнацыянальных вечароў. Арганізаваны мопраўскія куткі, выпушчаны насценныя газеты.

Выраслі сотні здольных агітатараў. Акрамя 300 актывістаў, уцягнутых гаркомам партыі ў работу на выбарчых участках, у гэтай рабоце ўдзельнічаюць сотні радавых членаў МОПР'а. У гэтым задае прыклад 6-ы камбінат. Тут большасць членаў МОПР'а актыўна ўдзельнічае ў выбарчай кампаніі.

Растуць паступленні мопраўскіх узносаў і добраахвотных грашовых афяраванняў. Сума апошніх перавышае 5 тысяч рублёў.

Ячэйкі МОПР разгортваюць соцыялістычнае спаборніцтва. Дагаворы аб соцыялістычным спаборніцтве заключаны паміж 2-м і 3-м тэкстыльнымі камбінатамі, 12 і 16 тэкстыльнымі фабрыкамі. Пераходны Чырвоны Сцяг абкома МОПР'а атрымала ячэйка 3-га камбіната, якая паказала лепшыя ўзоры работы.

Асноўнай задачай у рабоце МОПР'а на бліжэйшы час з'яўляецца: пад кіраўніцтвам партарганізацый добра паставіць сярод працоўных інтэрнацыянальна-выхаваўчую работу, уцягнуць у рады МОПР шырокія масы працоўных горада і вёскі. Інтэрнацыянальна-выхаваўчая работа павінна праводзіцца пад знакам згуртавання працоўных горада і вёскі вакол комуністычнай партыі, рашучага выкрыцця ўсякіх нацыяналістычных і шавіністычных варожых элементаў.

Як недахоп у рабоце арганізацыі МОПР'а, па нашай области трэба адзначыць тое, што дагэтуль яшчэ ў радзе раёнаў і гарадоў, як Ломжа, Граева, Замбраў, Саколка, Супрасль, Лапы, Валкавыск, мопраўскія арганізацыі толькі робяць першыя крокі. А ў радзе іншых гарадоў мопраўскія арганізацыі яшчэ не створаны.

Асобна трэба адзначыць работу па аказанню дапамогі былым палітычным зняволеным і палітычным эмігрантам, якія прыбылі ў заходнія області БССР пасля вызвалення Заходняй Беларусі Чырвонай Арміяй. Дзякуючы дапамозе партыйных і совецкіх органаў больш 600 былых палітычных зняволеных атрымалі працу, магчымасць жыць і лячыцца пасля многіх год мучэнняў у казематах панскай Польшчы. 18 таварышоў ужо выехала на лячэнне ў санаторыі Крыма, Каўказа і БССР. У бліжэйшым часе выедзе другая група хворых таварышоў. Акрамя гэтага дапамога выразілася і ў выдачы раду таварышоў вопраткі, бялізны і грашовай дапамогі. У гэтым аказаў дапамогу і Цэнтральны Камітэт МОПР'а СССР.

Радуючыся звароту лепшых сваіх сыноў і дачок, якія былі зняволены доўгія годы ў турмах панскімі катамі, слухаючы аб іх жудасных перажываннях, працоўныя Беластоцкай області ўзмоцняць пачуццё міжнароднай салідарнасці, любоў да таго, хто нам даў свабоду—да вялікага Сталіна.

Л. Гольцэр.
адказны сакратар Беластоцкага абкома МОПР'а.

Ніколі гэтага не забудзем

Рабочыя і сяляне Беластоцкай області ніколі не забудуць жахаў, жудасных здзекаў і гвалтоўных расправаў, перанесеных у турме народаў—былой панскай Польшчы.

Боллю сціскаецца сэрца, калі ўспамінаеш аб лепшых сынах народа, якія пакутліва загінулі за вызваленне працоўных. А ўспамінаць трэба—каб яшчэ больш узняць нянавісць працоўных да ворагаў совецкага народа, самаадданa мацаваць нашу любімую і дарагую соцыялістычную радзіму—СССР.

Раскажу аб страшным, крывавым мінулым, што канула цяпер у вечнасць.

ТАВАРЫШ ДЗЁМКА

Тав. Дзёмка (Сяргей Багданюк) быў высокі, шыракаплечы асілак. Ён мог у зімовую завіруху прайсці 70 кілометраў, каб пабыць на нелегальным сходзе і, вярнуўшыся дамоў, весела сказаць гаспадыні:—А зараз давай капусты паядзім!

Жыў—кіпеў. Змагаўся — гарэў. Калі прыехала банда паліцэйскіх яго арыштаваць—уцёк. Праследвалі 13 паліцэйскіх, з якіх два конных. Рэчка, за ёй лес—і выратаванне. Скачок у ваду. Пагубіў круты бераг. Злавілі, закавалі, білі. Адвялі ў Камянец. Катавалі—маўчаў. У ноч з 3 на 4 сакавіка 1933 года, па дарозе ў Брэст забілі.

І яшчэ адзін. Паблізу Белавежскай пушчы, на паліцэйскім участку быў насмерць закатаваны тав. Тарасевіч — беспартыйны селянін. Паліцэйскія павесілі яго труп. «Моў, сам не хацеў жыць»... Лютаваў белы, жудасны тэрор.

ВЛАДА БЫТОМСКАЯ

Влада Бытомская—лодзінская тэкстыльшчыца. Высокая, русая, сінявокая, уся светлая. Дзеці заўсёды імкнуліся да Влады. І хоць не вучоная—свой універсітэт праходзіла ў турме, у якой тамілася 9 год, — пісала вершы. Вострыя, гучныя вершы пра барацьбу. Вышла Влада на волю і рыхтавала стачку. І жыццё скончыла ў рабочым Лодзі, у барацьбе.

У закінутым завулку нейчыя зверскія рукі забілі Владу. І як! Дротам звязалі рукі, рот заткнулі, аблілі бензінам, падпалілі. Гэта было ў студзені 1938 года. Жыўём згарэла Влада. Не, не згарэла Влада, асталася ў рабочых сэрцах, як заклік да барацьбы!

МАРУСЯ СОЛЯК

І яшчэ была Маруся Соляк—хатняя работніца. 16-гадовай яна пайшла на дэманстрацыю і трапіла ў турму. Адсядзела і прышла зноў на многа год. У турме ў яе нарадзілася Неля. Расла Неля на турэмных харчах. І адзін раз, у дзень 1 мая, калі на грудзях квітнелі чырвоныя стужкі, у камеру ўварваліся дазорцы, адкінулі Нелю ад маці і білі Марусю. З той пары Неля дзіка крычала кожны раз, як адчыняліся дзверы камеры і яна бачыла зялёны мундзір.

ПРАДЗІЛЬШЧЫКІ І ТКАЧЫ БЕЛАСТОКА

У Беластоку грукаталі варштаты і ўбіралі ў сябе жаночыя маладыя годы і радасць. Рана сівелі, рана баразніліся маршчынамі твары тэкстыльшчыц. Вось тав. Раманоўская. Дваццаць год прала ніткі на фабрыканта і аставалася непісьменнай. У яе былі дзеці, але вучыць іх яна не магла—не было сродкаў. З беспрацоў'я, голаду, горкіх мацярынскіх слёз за дзяцей, якія пакутвалі ў турме, спралася нястрымная нянавісць да ворага, воля да барацьбы.

І ў 1933 годзе баставалі работніцы фабрыкі б. Сокал-Зільберфеніга. Работніцы занялі фабрыку і ўпорна змагаліся за хлеб для сябе і дзяцей. У гэтым-жа годзе на Супрасльскай дарозе паліцыяй былі забіты двое рабочых дэманстрантаў—стачачнікаў. А ў 1937 годзе рабочыя і работніцы фабрыкі б. Бекера баставалі 8 месяцаў. Занялі фабрыку і з небывалай вытрыманасцю змагаліся за агульную справу вызвалення ад эксплаатацыі.

Барацьба рабочых і сялян у былой панскай Польшчы злівалася ў адзіны паток. У 1933 годзе сяляне Пружан прыслалі бастуючым тэкстыльшчыкам Беластока муку і 70 рублёў грашыма, умацоўваючы гэтым саюз рабочых і працоўнага сялянства ў барацьбе супроць капіталістаў і памешчыкаў.

ПРУЖАНЫ

1933 год. Гераічная забастоўка возчыкаў-сялян цягнулася 4 з паловай месяцы. Спачатку тры вёскі, праз дзень—пяць, праз некалькі —17, а потым і 40. Стойка змагаліся возчыкі, хаця перажывалі голад. Хлеба не было, а рашылі: на ўступкі не ісці. Патрабавалі — вызваліць арыштаваных таварышоў. І гэтым заклалі палітычную забастоўку. З'явіліся карныя экспедыцыі. Арыштавана было 70. І ўсе яны, як адзін, пад катаваннем маўчалі. Ніводзін не выдаў.

НАВАСЁЛКІ — КОБРЫН

Хваляваннем напаўняецца сэрца, калі ўспамінаеш аб цяжкіх днях (жнівень — верасень 1933 года) працоўных вёскі Навасёлкі і мястэчка Кобрын у час утворанай польскімі ўладамі пацыфікацыі. Вельмі многа перажыта, словы бедны і немагчыма выказаць пра зверыную нянавісць катаў да кобрынскіх таварышоў. І ніколі працоўныя не забудуць польскую «культуру», прынесеную ў беларускую вёску—электрычныя машынкі, якімі бесчалавечна мучылі сялян Навасёлак.

Успаміны аб гэтым цяпер толькі прабуджаюць новую энергію, нястрымны парыў да соцыялістычнага будаўніцтва. Будзем нястомна змагацца за наша радаснае сёння, бо ніколі не вернецца ўчарашні подлы, нечалавечы свет катаванняў, прыгнечання, правакацый і няволі.

Цяпер вясна. Яркі і радасны совецкі дзень. Незвычайная цеплыня, якая ідзе ад жыватворных праменняў вялікай Сталінскай Канстытуцыі, саграве кожнага працоўнага ў яго плённай рабоце на дабро соцыялістычнай радзімы. І вызвалены народ творыць новае, шчаслівае жыццё—соцыялізм.

Рэгіна Каплан.

ЗА РУБЯЖОМ

ПРЭЗІДЭНТ ФІНЛЯНДЫІ РАТЫФІКАВАЎ СОВЕЦКА-ФІНЛЯНДСКІ МІРНЫ ДАГАВОР

Стокгольм, 17 сакавіка. (ТАСС). 16 сакавіка прэзідэнт Фінляндскай рэспублікі Каліо ратыфікаваў мірны дагавор, заключаны паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй. Прэзідэнт упаўнаважыў міністра Паасіківі і члена сейма прафесара Войонмаа зрабіць абмен ратыфікацыйных пактаў у Маскве, згодна артыкулу IX дагавора.

Працоўныя Англіі вітаюць мірную палітыку СССР

Лондан, 17 сакавіка, (ТАСС). Заключэнне мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй сустрэнута працоўнымі Англіі з вялікім задавальненнем. «Дэйлі уоркер» надрукавала заяву былога генеральнага сакратара нацыянальнага саюза паравозных машыністаў і качагараў Сквенса, у якім ён вітае заключэнне дагавора паміж СССР і Фінляндыяй, як новую перамогу мірнай палітыкі СССР. Сквенс адзначае, што Чырвоная Армія паказала высокія ўзоры гераізма і доблесці. У сваёй заяве Сквенс асудзіў рэакцыйных лідэраў лейбарысцкай партыі, якія з самага пачатку ваенных дзеянняў у Фінляндыі выступалі як ярыя агенты падпальшчыкаў вайны, уцягнуўшых Фінляндыю ва ўзброены канфлікт з Совецкім Саюзам.

«Гісторыя прарыву совецкімі войскамі лініі Маннергейма, — піша ваенны аглядальнік «Дэйлі уоркер», — увойдзе ў ваенны летапіс, як бліскучы ўзор ваеннага майстэрства».

ЗАМЕЖНЫ ДРУК АБ ЗАКЛЮЧЭННІ МІРНАГА ДАГАВОРА ПАМІЖ СССР і ФІНЛЯНДЫЯЙ

ГЕРМАНІЯ

Берлін, 17 сакавіка. (ТАСС). Увесь германскі правінцыяльны друк працягвае адгукацца на заключэнне совецка-фінляндскага мірнага дагавора. Газеты змяшчаюць тэкст дагавора, карту Фінляндыі з абазначэннем яе новых усходніх граніц і перадавыя артыкулы, прысвечаныя мірнаму дагавору. Газета «Кенігсбергер альгемейне цэйтунг» асабліва падкрэслівае поспехі Чырвонай Арміі і гераізм яе байцоў.

«Рэйніш-вестфалішэ цэйтунг» у перадавым артыкуле «Мір на поўначы» піша: «Масква абгрунтоўвае свае патрабаванні змены граніц на Карэльскім перашыйку і стварэння ваенна-марской і паветранай базы на паўвостраве Ханко неабходнасцю забеспячэння безапаснасці Ленінграда». Усе наступныя падзеі, працягвае газета, паказалі, што Совецкая Расія нічога большага і не дабівалася ў Фінляндыі. Мірны дагавор з'яўляецца дастатковым таму доказам.

ЭСТОНІЯ

Таллін, 17 сакавіка. (ТАСС). Эстонскія правінцыяльныя газеты друкуюць матэрыялы аб мірным дагаворы паміж СССР і Фінляндыяй. «Нейе маа», «Лыўна эсці», «Сакала», «Вірумаа тэатая» друкуюць таксама перадавыя артыкулы «Праўды» і «Известий». «Совецкі Саюз, — піша газета «Сакала»,—не зацікаўлен у атрыманні фінскіх земляў. Яму неабходна забяспечыць толькі безапаснасць Ленінграда. Іменна гэтага ён дабіваўся восенню мінулага года».

Газета «Вірумаа тэатая» піша: «Мір пануе на ўсіх граніцах СССР. Забяспечана безапаснасць Ленінграда, другога па велічыні горада Совецкага Саюза. Нанова будуць наладжаны эканамічныя сувязі паміж СССР і Фінляндыяй на карысць абодвум краінам».

«Мы, — працягвае газета,— з поўным задавальненнем вітаем спыненне вайны. Мы спадзяёмся, што зараз узмоцніцца рух суднаў па Балтыйскім моры, пашырыцца тавараабмен і будзе далей развівацца мірнае будаўніцтва».

БАЛГАРЫЯ

Сафія, 17 сакавіка. (ТАСС). Газета „Вечэрна бургаска пошча" піша: „Значэнне мірнага дагавора паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй, улічваючы міжнародную абстаноўку, велізарнае". Газета адзначае бліскучую перамогу Чырвонай Арміі, якая ў кароткі тэрмін разбіла ўмацаваную лінію на Карэльскім перашыйку, што лічылася непрыступнай, і ўказвае, што Совецкі Саюз і ў далейшым будзе няўхільна ахоўваць свае граніцы.

ПАЎТОРНЫ ВІЗІТ УЭЛЕСА Ў ІТАЛІЮ

Парыж, 17 сакавіка. (ТАСС). 15 сакавіка Уэлес на зваротным шляху ў ЗША зноў прыбыў у Рым. Як паведамляе агенцтва Гавас, учора Уэлес у суправаджэнні пасла ЗША ў Італіі Філіпса быў прыняты італьянскім каралём, затым міністрам замежных спраў Чыано. Па паведамленню агенцтва Юнайтэд прэс, Уэлес меў таксама гадзінную гутарку з Мусаліні.

—о—

ПРЫЗЫЎ НОВЫХ ВАЕННААБАВЯЗАНЫХ У АНГЛІІ

Лондан, 16 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што на 6 і 27 Красавіка назначана рэгістрацыя новых ваеннаабавязаных, якім на працягу 1939 года споўнілася 25 і 26 год. Ваеннаабавязаныя, якім споўніцца 20 год, да 6 і 27 красавіка таксама павінны прайсці рэгістрацыю. Гэта рэгістрацыя ахопіць 600 тысяч чалавек.

—о—

НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ

Парыж, 17 сакавіка. (ТАСС). У афіцыяльным камюніке аб ваенных дзеяннях, апублікаваным 16 сакавіка ўвечары ў Парыжы, адзначаюцца «дзеянні артылерыі ў раёне Саара. Французскія пасты адкінулі патрулі праціўніка на захад ад Вегезаў. Дзе-ні-дзе адбывалася перастрэлка цераз Рэйн».

—о—

АПЕРАЦЫІ НА МОРЫ

Лондан, 17 сакавіка. (ТАСС). Марское міністэрства аб'явіла аб пагібелі англійскага ўзброенага траулера „Мэіда", які наскочыў на міну. Як мяркуюць, камандзір траулера і пяць матросаў загінулі. Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што 13 сакавіка германская каманда патапіла свой параход „Ла Карунья", вадазмяшчэннем у 7.359 тон, каб пазбегнуць захвату яго англійскім ваенным караблём. Каманда ўзята на борт англійскага карабля.

Капенгаген, 17 сакавіка (ТАСС). Газета „Політыкен" паведамляе, што германскі параход „Эшэнхайм", вадазмяшчэннем у 5.200 тон, загінуў ля паўночна-заходняга ўзбярэжжа Ютландыі (Данія). Параход ішоў у Осла з грузам коксу. Загінула 11 маракоў.

Парыж, 17 сакавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Гавас, галандскае адміралцейства папярэдзіла ўсе навігацыйныя кампаніі аб спыненні суднаходства да новага распараджэння. Гэта мерапрыемства выклікана тым, што нармальная навігацыя паміж Англіяй і Галандыяй робіцца небяспечнай. Газета „Тэлеграаф" указвае, што за апошнюю ноч ля берагоў Галандыі было патоплена тры англійскіх судны.

ТЭАТР

„ПАГІБЕЛЬ ВОЎКА"

Другі Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр паказаў беластоцкаму гледачу арыгінальную беларускую п'есу «Пагібель воўка». Яе аўтар — таленавіты беларускі пісьменнік, ордэнаносец Эдуард Самуйлёнак, ён дапісваў сваю выдатную п'есу будучы прыкаваным да пасцелі страшэннай хваробай. «Пагібель воўка» — апошні твор Эдуарда Самуйлёнка.

Не гледзячы на безнадзейнае становішча свайго здароўя, пісьменнік стварыў паражаючую сваёй жыццесцвярджаючай сілай п'есу. Гэта — каштоўнейшы ўклад у беларускую совецкую драматургію.

Дзея адбываецца ў пагранічным калгасе. Калгаснікі рыхтуюцца да сустрэчы гасцей з прычыны дзесяцігоддзя калгаса. Начальнік пагранзаставы паведамляе аб парушэнні граніцы. Увесь калгас падымаецца на дапамогу пагранічнікам. Мацёры вораг ляснік Харкевіч хавае парушальніка.

На пасаду старшыні РВК прабраўся вораг, трацкіст Абабурка. Разам з загадчыкам райза Францевічам ён вядзе варожую шкодніцкую дзейнасць.

Правёўшы персанажаў праз рад вострых сюжэтных сітуацый, аўтар заканчвае п'есу калгасным вечарам, у час якога студэнтка Насця выкрывае варожы твар свайго бацькі Харкевіча, начальнік пагранзаставы паведамляе аб затрыманні парушальніка граніцы шпіёна Шабінскага, Абабуркі, Францевіча і іх спадручных.

Усе героі п'есы рэзка падзелены на дзве групы: з аднаго боку — вобразы чэсных калгаснікаў, начальнік пагранзаставы, сакратар райкома партыі, настаўніца; з другога боку — цэлая галярэя вобразаў ворагаў: шпіён Шабінскі, ляснік Харкевіч, Абабурка, Францевіч, Вырвіч, Мікола і слюнявы, агідны нацдэмаўскі барзапісец «паэт» Апанас Шышка.

Ідэя п'есы — бязлітасная барацьба з ворагам - ваўком і пагібель апошняга ў гэтай барацьбе. Правільна паказваючы адзін з бакоў нашай рэчаіснасці — калгаснае жыццё, — п'еса мабілізуе гледача на павышэнне рэвалюцыйнай пільнасці.

Калектыў тэатра стварыў цікавы хвалюючы спектакль, які мае вялікае выхаваўчае значэнне. Спектакль трымае гледача ў стане напружанасці. Глядач шчыра, ад душы смяецца, запалены юмарам Язэпа — Малчанава, апладыруе поспехам пагранічнікаў, сціскае рукі ў парыве нянавісці, калі на сцэне паказваецца подлая дзейнасць ворагаў.

У цэтры ўвагі спектакля—вобраз ворага Харкевіча. Гэта — мацёры воўк, верны лакей пані Шабінскай, хітры, зваротлівы звер, які трымае сувязь з заграніцай і арганізоўвае дыверсійныя акты ў калгасе. Харкевіч паказан зверам у быце: ён замучыў сваю жонку і здзекваецца над дачкой. Народны артыст БССР А. К. Ільінскі поўнасцю раскрыў перад гледачом Харкевіча. Ён іграе выдатна. У яго няма і ценю трафарэтнасці, хадульнасці ў вобразе ворага, што часта сустракаецца на сцэне, ён поўнакроўны, рэалістычны.

Запамінаецца ігра артыста С. В. Скальскага, які стварыў вобраз труслівага і нікчэмнага трацкіста Абабуркі. Як затраўленая мыш мітусіцца ён ад аднаго тэлефона да другога, калі бачыць, што яго злачыннай дзейнасці прыходзіць канец. Дрыжачым голасам ён выказвае перспектыву ўсіх ворагаў нашай краіны: «хацеў-бы я зашыцца ў такую нару, каб ніхто не ведаў, што ёсць на свеце Абабурка»..

Не такі другі вораг — Францевіч, якога іграе артыст Л. Г. Кастрыца. Гэты не траціць самаўпэўненасці, да канца застаецца верным сваёй воўчай натуры. Ён заўсёды падцягнуты, ён не напіваецца, падобна Абабурку, у рашучы момант.

Агіду выклікае палявод Вырвіч (іграе артыст І. А. Матусевіч). Вырвіч марыў аб буйнай кулацкай гаспадарцы на нямецкі манер, пралез у калгас у надзеі, што калгасы доўга не пратрымаюцца, і тут ператварыўся ў сляпога выканаўцу дыверсійных заданняў Харкевіча.

З найвялікшым лірызмам паданы ў п'есе вобразы калгаснікаў. Гэта працавітыя, чэсныя людзі, гарачыя патрыёты сваёй радзімы. Узяць хоцьбы Мірона Бокуця, калгаснага варгаўніка, які прайшоў цяжкі жыццёвы шлях, многа год правёў на царскай катарзе і зараз здабыў шчаслівую старасць у калгасе. Але ён не самасупакоіўся, ён не можа спакойна спаць, пакуль у калгасе ёсць ваўкі, якія труцяць насенне і коней, падпальваюць свіран. Заслужаны артыст БССР Ц. Н. Сяргейчык стварыў абаяльны, праўдзівы вобраз старога калгасніка.

Як заўсёды, выдатна іграе заслужаны артыст БССР П. С. Малчанаў, які ўнёс здаровы, жыццерадасны юмар у вобраз калгасніка Язэпа. Запамінаюцца вобразы калгаснага рыбака дзеда Анісіма (артыст В. С. Вялікі), які дрэнна чуе, бо набегла вада ў вушы, і з упартасцю юнака на працягу некалькіх дзён стараецца «увабраць» сама-вусача для гасцей; вобразы загадчыка конефермы Рабічкі (артыст І. І. Тупік), загадчыка МТФ Данілы (артыст А. М. Трус) і яго жонкі Сцепаніды (артыстка Л. І. Мазалеўская).

Асобна трэба адзначыць ігру начальніка пагранзаставы Усенка (артыст А. Г. Шэлег). З'яўляючыся ўвасабленнем большэвіцкай пільнасці, ён вядзе сваю ролю чотка, без лішніх слоў і жэстаў. Гэта жыццёвы вобраз слаўнага чэкіста.

Як на недахоп п'есы, а ў некаторай ступені і тэатра, укажам на недастаткова раскрыты вобраз сакратара райкома партыі Дабрыніна. Моцным звярыным натурам ворагаў трэба было проціпаставіць яшчэ больш моцныя вобразы комуністаў.

Слаба іграе артыст Р. В. Кавальчук, які не змог стварыць патрэбнага вобраза старшыні калгаса Буйко. Буйко—Кавальчук многа прысутнічае на сцэне, але ён не мае сваіх індывідуальных рыс. Кіруючая роля старшыні калгаса ў спектаклі не паказана.

Хочацца адзначыць добрае афармленне спектакля (мастак Е. Д. Нікалаеў). Выдатна перадана раніца з птушыным свістам у калгасным садзе.

У заключэнне трэба сказаць аб мове спектакля. У адрозненне ад папярэдніх перакладных п'ес, дзе мова была не заўсёды гладкай, у спектаклі «Пагібель воўка» гучэла сапраўды народная беларуская мова.

Цяжка пераацаніць значэнне спектакля «Пагібель воўка» для беластоцкага гледача. Яго паглядзелі дэлегаты абласной нарады працоўных сялян. Добра было-б, калі-б спектакль паглядзелі многія сяляне нашай вобласці.

Т. ЛЯСОВІЧ.

ВЕЧАР ІНТЭЛІГЕНЦЫІ, ПРЫСВЕЧАНЫ МОПРУ

16 сакавіка ў Беластоку ў Доме Чырвонай Арміі адбыўся агульнагарадскі вечар інтэлігнцыі, прысвечаны 69 гадавіне Парыжскай Комуны. Вечар адкрыла старшыня абкома медсанпрацы тав. Цэгельніцкая.

З цікавым дакладам аб Парыжскай Комуне і аб чарговых задачах МОПР'а выступіла былая палітзняволеная тав. Каплан.

З успамінамі выступілі былыя палітзняволеныя тт. Найдус і Шыманскі. Яны расказалі аб той вялікай дапамозе, якую аказваў у былой Польшчы МОПР палітзняволеным і іх сем'ям. Дзякуючы гэтай маральнай і матэрыяльнай дапамозе ніякія мучэнні і катаванні не маглі зламаць стойкай волі рэволюцыянераў.

Аднадушна прынята рашэнне аб выкліку мопраўцаў Брэсцкай вобласці на соцспаборніцтва за лепшую пастаноўку інтэрнацыянальнай работы.

З вялікім уздымам і натхненнем сход прыняў прывітальныя тэлеграмы таварышам Сталіну і Дзімітраву.



На здымку: вучаніца 3-й школы Харашук, удзельніца 2-кілометравага бегу на лыжным спаборніцтве г. Беластока. (Фота Сапір).

ПА БЕЛАСТОКУ І ВОБЛАСЦІ

ПЛАН ШКОЛЬНЫХ КАНІКУЛ

Беластоцкі гарком ЛКСМБ зацвердзіў план правядзення школьных канікул.

У плане намечана правесці цэлы рад лекцый, гутарак, сустрэч. Дзеці праслухаюць гутаркі аб дзіцячых чыгунках, адпачынку вучняў у прадстаячых піонерскіх лагерах, аб дзецях, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі сельскагаспадарчай выстаўкі і інш.

У поўных сярэдніх школах № 12, 8, 4 адбудуцца літаратурныя вечары, на якіх юныя паэты і пісьменнікі выступяць з чыткай сваіх уласных вершаў, апавяданняў. Акрамя гэтага школьнікі сустрэнуцца з артыстамі Беларускага драматычнага тэатра, правядуць рад культпаходаў у тэатр, кіно.

Перад гістарычным днём 24 сакавіка адбудзецца агульнагарадскі вечар вучняў старэйшых класаў, прысвечаны выбарам у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

СХОД МОЛАДЗІ

16 сакавіка ў клубе м. Заблудава адбыўся сход працоўнай моладзі. Больш 350 маладых выбаршчыкаў, якія ўпершыню ў сваім жыцці будуць удзельнічаць у выбарах, праслухалі даклад сакратара Заблудаўскага ГК ЛКСМБ аб удзеле моладзі ў соцыялістычным будаўніцтве.

Хвалюючымі былі выступленні камсамольцаў Нанякова, Раманенкі і маладых рабочых скурзавода Хароўскага і Бернштэйна. Усе яны гаварылі аб вялікіх правах моладзі Совецкага Саюза, дзякавалі комуністычнай партыі, ураду і асабіста таварышу Сталіну за шчаслівае сёння і радаснае заўтра.

ВЫПУСК КУРСАНТАЎ

У Парэччы закончылі сваю работу раённыя курсы сялянскага актыва. На курсах займалася 40 лепшых актывістаў з вёсак раёна.

Курсанты акрамя пытанняў агратэхнікі і заатэхнікі вывучылі Сталінскую Канстытуцыю, новы выбарчы закон, статут сельскагаспадарчай арцелі. Курсанты накіраваны ў сельсоветы раёна ў якасці агітатараў і прапагандыстаў.

ЛЕКЦЫЯ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

16 сакавіка ў Доме партактыва адбыўся сход настаўнікаў гор. Беластока. Лектар ЦК КП(б)Б тав. Хэйфец прачытаў лекцыю аб «Дзяржаўнай пабудове СССР». Лекцыю праслухала больш 100 чалавек.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

ПАСТАНОВА

Гарадскога выканаўчага камітэта гор. Беластока ад 11-га сакавіка 1940 года.

АБ ПРАВІЛЬНЫМ СКАРЫСТННІ ГАНДЛЁВЫХ ПАМЯШКАННЯЎ ПА Г. БЕЛАСТОКУ

У сувязі з тым, што рад гаспадарчых і совецкіх арганізацый гор. Беластока пачынаюць скарыстоўваць гандлёвыя памяшканні пад канторы і іншыя мэты, а прыватныя домаўласнікі перадаюць гандлёвыя памяшканні пад склады, кватэры, — для правільнага скарыстання гандлёвых памяшканняў і недапушчэння звужэння гандлёвай сеці гарадскі выканаўчы камітэт гор. Беластока **пастанаўляе:**

1. Забараніць усім гаспадарчым і совецкім арганізацыям гор. Беластока займаць гандлёвыя памяшканні пад якія-б гэта ні было іншыя мэты, а занятыя гандлёвыя памяшканні пад канторы, майстэрні, склады і кватэры неадкладна вызваліць.

Абавязаць гаркамгас перадаць усе гандлёвыя памяшканні гандлёвым арганізацыям для адкрыцця магазінаў.

2. Абавязаць усіх домаўласнікаў, якія маюць у сваім уладанні гандлёвыя памяшканні, у выпадку спынення гандлю, самім не перадаваць таковыя без ведама гаркамгаса і гарадскога гандлёвага аддзела, а пераданыя гандлёвыя памяшканні пад іншыя мэты, вызваліць, паведаміўшы гаркамгасу для перадачы гандлёвым арганізацыям для адкрыцця магазінаў на дагаворных пачатках.

3. Даручыць загадчыку гарадскім гандлёвым аддзелам узяць на учот усе гандлёвыя памяшканні па гораду Беластоку, вынікі ўчоту дакласці горвыканкому.

4. Віноўныя ў парушэнні данай пастановы будуць прыцягвацца да адказнасці.

Старшыня гарадскога выканаўчага камітэта
ГАРЭЛІК
Адказны сакратар
ОКУНЬ

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара — 22 (па камутатару аблвыканкома) і 49 (гарадскі), сакратарыята, партыйнага і совецкага аддзелаў — 23 (па камутатару аблвыканкома), прамысловага, сельскагаспадарчага, культурнага і інфармацыйнага аддзелаў — 17-62 (гарадскі). Тэлефон выдавецтва і аддзела аб'яў — 16-10. Тэлефон друкарні і начной рэдакцыі — 5-21.
Падпіску на газеты прымае «Саюздрук» (Тэлефон 5-14).

Упаўнаважаны аблліта № 376. 1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку